**Библиографические ссылки**

1. Социальных стереотип [Электронный ресур] // Большой психологический словарь ; под ред. Б. Г. Мещерякова, В. П. Зинченко. – М. : Прайм-Еврознак, 2003. – Режим доступа: https://psychology.academic.ru/7117. – Дата доступа: 13.04.2023.
2. Мопассан, Г. Пышка [Электронный ресурс] / Г. де Мопассан // Французская новелла XIX века ; сост. Б. П. Мицкевич : пер. с франц. – Минск, 1984. – Режим доступа: https://ocr.krossw.ru/html/mopassan/mopassan-pyshka-ls_1.htm. – Дата доступа: 13.04.2023.
3. Достоевский, Ф. М. Преступление и наказание [Электронный ресурс] / Ф. М. Достоевский // Собр. соч. : в 15 т. – Л., 1988–1996. – Т. 5. – 1989. – Режим доступа: https://ilibrary.ru/text/69/p.1/index.html. – Дата доступа: 13.04.2023.

УДК 821.161.3:[82-32] М. Зарэцкі

# ЛЮБОЎНЫ ТРОХКУТНІК У АПАВЯДАННІ М. ЗАРЭЦКАГА «ОЙ, ЛЯЦЕЛІ ГУСІ...»

Н. В. Гурская
*УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»;*
*(Мінск, Рэспубліка Беларусь)*
*Навук. кір. – Н. В. Заяц, к.філ.н., дацэнт*

# THE LOVE TRIANGLE IN M. ZARETSKY'S STORY «OH, THE GEESE FLYING...»

N. V. Hurskaya
*Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank;*
*Minsk (Republic of Belarus)*
*Scientific advisor – N. V. Zaiats, PhD Associate professor*

Даследуецца спецыфіка раскрыцця тэмы кахання ў апавяданні М. Зарэцкага «Ой, ляцелі гусі…». Адносіны герояў прадстаўлены ў выглядзе любоўных трохкутнікаў. Выяўляюцца адметнасці стасункаў паміж удзельнікамі трохкутнікаў. Акцэнтуецца ўвага на праўдападобнасці ўчынкаў персанажаў, іх матывацыі.

The specifics of the disclosure of the theme of love in M. Zaretsky's story «Oh, the geese were flying...» are investigated. The relationship between the characters is presented in the form of love triangles. Distinctive features of the relationship between the participants of the triangles are revealed. Emphasis is placed on the believability of the characters' actions and their motivations.

Ключавыя словы: М. Зарэцкі; «Ой, ляцелі гусі…»; тэма кахання; любоўны трохкутнік.

Keywords: M. Zaretsky; «Oh, the geese were flying…»; love theme; love triangle.

Тэма кахання – адна з асноўных у творчасці М. Зарэцкага. У апавяданні «Ой, ляцелі гусі…» (1929) інтымныя адносіны герояў укладваюцца ў схему любоўнага трохкутніка, і нават не аднаго.

**Трохкутнік «Адам – Сяргей – Стася».** Любоўныя трохкутнікі заўсёды замінаюць на жыццёвым шляху галоўнаму герою апавядання Адаму Барковічу. Гэты персанаж мае вельмі жорсткі і прагматычны характар, паўстае амаральным і беспрынцыпным. Невыпадкова пісьменнік так разгортвае сюжэт, што Стася, жонка Барковіча, моцна хварэе і трапляе ў бальніцу. Праз гэтую крытычную сітуацыю выкрываюцца сапраўдныя адносіны Адама да жанчыны, якую калісьці кахаў. Барковіч бачыць, што жонка страціла маладосць, а з ёй і прыгажосць, яна больш не вабіць яго, а наадварот – выклікае непрыемныя пачуцці: «Яна зусім страшная стала, я ледзьве пазнаў. Дужа непрыемна глядзець. На ёй ужо відаць адбітак смерці. І яна сама ведае, яна добра ўсвядоміла свой стан» [1, с. 418]. Адама настолькі не цікавіць здароўе жонкі, што ён жадае хутчэй скончыць сустрэчу ў «белым астрозе»: «Ён не хацеў крыўдзіць яе і таму застаўся сядзець да абходу, застаўся лічыць цягучыя, нудныя, як у магіле, хвіліны» [1, с. 416]. Як толькі Стася занемагла і адчула сваё бяссілле, Барковічу яна стала непатрэбнай.

Верагодна, на хуткаплыннасць адносін Барковіча з жанчынамі паўплываў і яго блізкі сябар Сяргей, задзейнічаны ў любоўных трохкутніках Адама. Гэты чалавек усё жыццё ішоў поплеч з Барковічам; жанчыны, якіх абіраў Адам, яму таксама падабаліся. У Стасю Сяргей даўно быў закаханы, заўсёды перажываў за яе і быў побач.

Маладая жонка Барковіча ў сваю чаргу, спрабуючы захаваць цікавасць мужа праз рэўнасць, нярэдка ўспамінала Сяргея пры размове: «Барковічу зразумела: яна пачула яго настрой, яго холад і таму памянула Сяргея. Так рабіла яна даўней – і даўней дасягала свайго» [1, с. 416]. Але і Стася, і Сяргей добра разумелі, што будучыні ў іх няма, бо дзяўчына ставілася да яго як да сябра і заўсёды была вернай жонкай для Адама. Сяргей пазней сам прызнаецца, што яго каханне не падобнае на звычайныя адносіны паміж жанчынай і мужчынай: «Я яе зусім асабліва любіў і люблю... не так, як ты... Я табе не замінаю... Я яе буду заўсёды любіць... заўсёды...» [1, с. 439].

Сяргей не мог зразумець іронію і безуважнасць Адама да жонкі, у якую сам быў моцна закаханы. Аднак, як выявіцца, не так ужо і моцна.

**Трохкутнік «Адам – Сяргей – Таццяна».** Нягледзячы на хваробу Стасі і на само яе існаванне, Адам Барковіч пачынае адносіны з іншай жанчынай – настаўніцай Таццянай. Думаецца, складана назваць іх адносіны каханнем, бо Адам нібы праводзіць доследы на пачуццях Таццяны, спрабуе «вывернуць»

заганы яе душы – і ў яго гэта атрымоўваецца. Барковічу імпануе ўнутраная лёгкасць і жаночая прыгажосць Таццяны. Сама настаўніца поўная пяшчоты і цеплыні да гэтага мужчыны, які вабіць яе незалежнасцю і сур'ёзнасцю. Жанчына гатова ўпусціць яго ў сваё жыццё і ўжо марыць пра сумесную будучыню. Але ці патрэбна гэта Барковічу? Відаць, што не, бо Адам – чалавек-даследчык, чалавек-эксперыментатар, які радуецца, калі чуе Таццяніны жорсткія выказванні ў адрас Стасі і бачыць, што злосць і агіда адкрыта «выходзяць» з суперніцы: «У шэрых ненатуральна бліскучых вачах яе Барковіч убачыў цэлы віхор розных супярэчлівых пачуццяў: там халодная злосць мяшалася з палкаю радасцю, там балючы дакор пераплятаўся з глыбокай, шчырай удзячнасцю» [1, с. 430]. Адама цікавіць выкрыццё заган настаўніцы, ён нават не хавае гэтага, з прыемнай асалодай прагаворваючы сам сабе: «Якія бязлітасныя гэтыя самкі!» [1, с. 431].

Прыехаўшы да Барковіча ў вёску, Сяргей стараўся згладзіць непрыемныя ўражанні ад нядаўняй размовы ў бальніцы: вельмі радасна рэагаваў на любое пытанне Адама пра Стасю ў спадзяванні вярнуць сяброўства. «Сяргею гэта дужа падабаецца, ён укладае ў апавяданне ўсю шчырасць свае істоты, ён увесь прасвятляецца і зазірае ў вочы Барковічу з асабліва глыбокай палкай удзячнасцю» [1, с. 433]. Але Сяргей добра разумее, што Адам не кахае Стасю, больш за тое, яна яго ўжо ўвогуле не цікавіць.

З прыездам Сяргея любоўная гісторыя нібы паўтараецца. Сябру спадабалася каханка Барковіча Таццяна, але на гэты раз ён не збіраецца адступаць, як у выпадку са Стасяй, і нават марыць пра будучае: «Ты не ведаеш, я ж гэта наўмысля хаджу да Тацяны... Яна мне адразу надзвычайна ўпадабалася. У ёй ёсць нешта такое, што ўвесь час цягне мяне да яе – я гатоў цэлыя суткі сядзець з ёй, сапраўды... Яна разумная і добрая. У ёй так многа ласкі, сімпатыі... Слухай, Адам, усё можа быць...» [1, с. 439]. Сама Таццяна адчувае, што не зможа жыць у спакоі з едкім па характары Барковічам, які раз за разам правакуе яе на прызнанні ва ўласнай несумленнасці, выклікае віну перад Стасяй. Таццяна сумняваецца ў магчымасці пабудаваць з ім сям'ю: «З табой... заўсёды... Нашто ты гэта гаворыш? Ты сам не верыш гэтаму... Ты ж усё роўна кінеш. Такі ты чалавек... Я і цябе баюся... больш, можа, чымся Стасі...» [1, с. 441].

«Відавочна, – заўважае Т. Тарасава, – што закаханы ў Стасю Сяргей, намаляваў пекны вобраз жонкі Адама, і Таццяна віну за сямейны разлад Барковічаў усклала на Адама і задумалася, а ці не такі ж самы лёс напаткае і яе. Вось адкуль у дзяўчыны насцярожанасць і недавер да Барковіча» [2, с. 261]. Сапраўды, Адам усім сваім выглядам у бальніцы паказваў, наколькі яму

непрыемна знаходзіцца побач са Стасяй, у думках адзначаў, як яна змянілася знешне і як прыкра яму бачыць такое людское бяссілле. Высокая верагоднасць таго, што ў аналагічнай сітуацыі ён такім жа чынам паставіцца і да іншай жанчыны. І Таццяна гэта прадчувае: «Ты і мяне так... потым... калі захварэю...» [1, с. 430].

У і без таго няпростыя стасункі Барковіча з Таццянай укліньваецца трэці лішні – Сяргей. Гэтая сітуацыя балюча б’е па мужчынскім гонары Барковіча, ён не разумее Таццяну, ён жадае перамогі, жадае быць галоўным сярод іншых «ігракоў»: «Жыццё супраць яго, перамаглі варожыя сілы. Скруцілі шчытным калючым вязьмом, не даюць вольна дыхнуць, здзекваюцца, святкуюць сваю паганую перамогу. Пачакайце! Ён яшчэ не здаўся, яшчэ будзе змаганне. Ён яшчэ возьме сваё!» [1, с. 443].

З такімі думкамі Адам прапаноўвае Сяргею схадзіць на паляванне, дзе не вытрымоўвае і выказвае ўсё, што думае. Барковіч і тут выступае маніпулятарам і правакатарам: пачынае размову з разваг пра моцнае сяброўства, каб паказаць, наколькі блізкім для яго быў Сяргей і да чаго гэта прывяло. «У нас былі моманты, калі мы не маглі жыць адзін без аднаго. Мы часам спрачаліся, лаяліся, крыўдзілі адзін аднаго, а потым шукалі выпадку, каб зноў сустрэцца. Не маглі абысціся без гэтай сустрэчы... Праўда? Ну, вось...» [1, с. 445]. Але цяпер яны сталі ворагамі, і Адам вінаваціць у сваіх любоўных няўдачах Сяргея, зусім забыўшыся на ўласныя ўчынкі і заганы: «Слухай далей... Вось з Тацянай... Ты не дужы сам для сябе знайсці што-небудзь у жыцці. Ты, як слімак, падпаўзеш да чужога і рад, што знайшоў дзе прысланіцца. І просты жаль да цябе, перамяшаны з агідай, ты гатоў прыняць за каханне! Ха-ха!.. Цябе кахаць! Такога склізнёнка?» [1, с. 446]. Са словамі Барковіча нельга не пагадзіцца: сапраўды, Сяргей увесь час ідзе следам за Адамам, нібы не мае свайго асабістага жыцця і сваіх уласных поглядаў. Ён чапляецца за чужыя падзеі і прыстасоўваецца да іх, але Сяргей ніколі не быў бязлітасным і злачынным чалавекам, ён заўсёды слухаў сваё сэрца.

Адам з асалодай вымяшчаў сваю злобу на былым сябры, нібы праводзіў эксперымент, да чаго можа дайсці чалавек у жаданні абараніць свой гонар. І вынікі «эксперыменту» аказаліся нечаканымі – ён здолеў абудзіць у чалавеку звера: усё жыццё прывязаны да яго Сяргей страляе ў Адама. Страта кантролю, маральнае падзенне Сяргея прынесла задавальненне Барковічу: «Ён адчувае сябе пераможнікам. Ён сам не ведае, у чым гэта перамога, але ў душы ў яго – урачыстасць, на сэрцы – спакойная, чыстая радасць» [1, с. 448]. Яго душа не атрымоўвае асалоды ад шчырых і цёплых пачуццяў ні ў адносінах з сябрам, ні ў адносінах з жанчынамі. Адам адчувае задавальненне, калі хтосьці адкрывае для

яго свой унутраны свет, што поўніцца заганамі і недахопамі. Відаць, невыпадкова аўтар звяртае ўвагу на тое, што мужчына вельмі любіць паляваць. Але Барковіч палюе не толькі на жывёл, але і на чалавечыя пачуцці, сваімі кулямі ён дакладна трапляе ў сэрца і радуецца гэтаму.

Такім чынам, у апавяданні «Ой, ляцелі гусі…» пры раскрыцці тэмы кахання пісьменнік выкарыстаў класічную схему «любоўны трохкутнік». У творы такіх трохкутнікаў, з якіх героі не могуць знайсці выйсце, два: «Адам – Сяргей – Стася», «Адам – Сяргей – Таццяна». У выніку для ўсіх каханне аказваецца драматычным і нешчаслівым.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. Зарэцкі, М. Збор твораў : у 4 т. Мінск : Маст. літ., 1989–1992. – Т. 1 : Апавяданні. – 1989. – 526 с.

2. Тарасава, Т. М. Праблемы духоўнай адзіноты ў аповесцях «Вікторыя» Кнута Гамсуна і «Ой, ляцелі гусі...» Міхася Зарэцкага [Электронны рэсурс] / Т. М. Тарасава // Славянскія літаратуры ў кантэксце сусветнай : матэрыялы V Міжнар. навук. канф., прысвеч. 80-годдзю Беларус. дзярж. ун-та, Мінск, 16–18 кастр. 2001 г. : у 3 ч. – Мінск, 2001. – Ч. 2. – С. 257–263. – Рэжым доступу: https://elib.bspu.by/handle/doc/51952. – Дата доступу: 03.04.2023.



УДК 821.161.3


## АКАЗІЯНАЛЬНЫЯ НАЗОЎНІКІ Ў ПАЭЗІІ МІКОЛЫ ШАБОВІЧА


А. У. Кашчэева

*УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»;*

*Мінск (Рэспубліка Беларусь)*

*Навук. кір. – Т. А. Астапчык, к.філ.н.*


## OCCASIONAL NOUNS IN THE POETRY BY MIKOLA SHABOVICH


A. Kashcheeva

*Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank;*

*Minsk (Republic of Belarus)*

*Scientific advisor – T. Astapchyk, PhD in Philology*



Артыкул прысвечаны даследаванню аказіянальных назоўнікаў вядомага беларускага паэта, кандыдата філалагічных навук Міколы Шабовіча. Матэрыялам для даследавання паслужыла паэтычная кніга «Я і Ты» (2019). Сабраныя метадам скразной выбаркі аказіяналізмы былі раскласіфікаваны ў залежнасці ад спосабу іх утварэння. На падставе